УДК 808.26-085

В. А. Кузьміч, заг. кафедры

# ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ СТЫЛІСТЫКІ ЯК НАВУКОВАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

This article deals with a history of stylistics as particular scientific discipline. Main stages of stylistics development are presented here. Experience of Belarusian linguists in this field is summarized and illustrated.

Стылістыка як навуковая дысцыпліна адносна маладая. Мяркуюць, што яна нарадзілася на мяжы XIX і XX стагоддзяў. Заснавальнікам стылістыкі лічаць французскага лінгвіста Шарля Балі. Сам тэрмін *стылістыка* з'явіўся ў еўрапейскіх мовах у XIX ст.

Аднак гісторыя стылістычнага мыслення і карані многіх сучасных канцэпцый сягаюць у далёкае мінулае, у тым ліку і антычнае. Пра гэта сведчыць нават нас тэрмін *стыль*. У Старажытным Рыме, які знаходзіўся пад магутным уплывам грэчаскай культуры, гэта слова спачатку мела значэнне «характар выказвання» (як вынік пераноснага значэння лац. *stylus* «палачка для пісьма на драўляных таблічках, пакрытых воскам»). Пазней слова набывае значэнне «тып выказвання», а ў перыяд Сярэднявечча – «разнавіднасць мовы». З XVII ст. пра стыль пачынаюць гаварыць не толькі ў адносінах да моўных выказванняў, але і да скульптурных, архітэктурных і музычных твораў (напр., гатычны стыль, стыль Рэмбранта, стыль Моцарта). У XX ст. гэты тэрмін адносіцца да розных паняццяў, напр., *стыль дзеяння, стыль у модзе.*

У антычныя часы стылістычнае мысленне развівалася пераважна ў сферы рыторыкі і паэтыкі. Гэта датычыць моўных сродкаў (напр., тропаў, фігур), а таксама стылёвых тыпалогій (напр., нізкі, сярэдні, высокі), а для стылю было важным супрацьпастаўленне паміж *recte* (правільна) і *bene* (добра, прыгожа). Калі нагадаць пяць частак рытарычнай тэорыі, якая ахоплівала: 1) *inventio (вынаходства, уменне знайсці арыгінальны падыход да тэмы выказвання)*, 2) *dispositio (кампазіцыя, уменне лагічна ўпарадкаваць элементы выказвання)*, 3) *elocutio (красамоўства, выкарыстанне такіх моўных сродкаў, якія б пераканалі слухача)*, 4) *memoria (запамінанне)*, 5) *pronuntiatio (абвяшчэнне – уменне выразна і пераканаўча выступаць з прамовай)*, то антычная стылістыка засяроджвалася на красамоўстве. Сярод антычных аратараў і тых, хто займаўся пытаннямі рытарычнай арганізацыі маўлення, трэба згадаць перш за ўсё грэчаскага аратара Дэмасфена, вучонага Арыстоцеля, рымскага прамоўцу, грамадска-палітычнага і культурнага дзеяча Марка Тулія Цыцэрона, аўтара знакамітага падручніка па рыторыцы «Выхаванне прамоўцы» Марка Фабія Квінтыліяна.

У антычным Рыме аратарам лічыўся *vir bonus, dicendi perit, Ous* (муж добры, дасведчаны ў маўленні). Упершыню гэта азначэнне ўжыў Марк Порцый Катон у адрасаваным свайму сыну Марку падручніку *De rhetorica (Рыторыка)*, які, на жаль, не захаваўся. Пазней такія ж словы паўторыць у сваім знакамітым творы *Institutio oratoria (Выхаванне прамоўцы)* Марк Фабій Квінтыліян, акцэнтуючы ўвагу у першую чаргу на маральна-этычных якасцях аратара як *мужа добрага*, без якіх рыторыка ператвараецца ў найбольш небяспечную пагрозу для грамадскага і прыватнага жыцця.

У красамоўстве Старажытнай Грэцыі і Рыма адрознівалі тры стылі: азіяцкі, атычны і радоскі, якія былі распаўсюджаны ў розных культурных цэнтрах Грэцыі (Малая Азія, Атыка са сталіцай Афінамі, востраў Радос). Азіяцкі стыль вызначаўся напышлівасцю, празмернай увагай да формы выказвання, таму лічыўся надуманым і пустаслоўным. Супрацьлегласцю азіяцкаму стылю стаў атычны з яго падкрэсленай сціcласцю і чысцінёй. У ім не было нічога лішняга і пустога. Радоскі стыль сумяшчаў функцыянальнасць атычнага стылю з моўнымі сродкамі іншых стыляў.

Акрамя таго, паводле функцыянальнай накіраванасці ў атычным аратарскім мастацтве вылучалі тры стылі: нізкі (служыў для выкладу спраў), сярэдні (пераважна для пераканання ці задавальнення слухачоў) і высокі (для абуджэння высокіх пачуццяў).

Увогуле класічная, а пасля яе і гуманістычная рыторыка характарызаваліся наступнымі прынцыпамі: *docere* (навучаць), *delectare* (прыносіць задавальненне), *movere* (узрушваць).

З цягам часу сферай ужывання рыторыкі становіцца не толькі аратарскае майстэрства,

але і ўся немастацкая проза (эпісталярны жанр, гістарыяграфія, канцылярская пісьменнасць, прапаведніцтва), у тым ліку і на нацыянальных мовах. Сама рыторыка як своеасаблівая тэорыя маўленчай дзейнасці паступова абмежавалася толькі красамоўствам (ars bene dicendi – майстэрства добра казаць), парушаючы антычнае адзінства зместу і формы. Адасабляецца паэтыка і вылучаецца граматыка як мастацтва правільнага маўлення. Такім чынам, з перыяду Рэнесансу рыторыка набліжаецца да стылістыкі ў яе сучасным разуменні. Таму рыторыку часта называюць навукай аб стылі, які ўпрыгожвае і ўзбагачае мову.

Абмежаванне рытарычнай тэорыі, у якой першапачаткова думка, этычная ацэнка і практычныя сродкі былі цесна звязаны, суправаджаецца ўсё больш моцнай тэндэнцыяй да нарматыўных і нават дагматычных паняццяў, напрыклад жорсткімі літаратурнымі канонамі (параўн.: *Паэтыка* Н. Буало). У XVIII і XIX стст. рыторыка асацыіруецца з падручнікамі практычнай стылістыкі і сістэмай моўных указанняў і рэкамендацый. Пачынаючы з XIX ст., рыторыка ў Еўропе занепадае як навука і мастацтва.

Ужо ў другой палове XVIII ст. веды пра стыль пачынаюць адасабляцца ад закасцянелай рыторыкі. Гэта звязана з адыходам ад разумення стылю як арганічнай сукупнасці правіл, якія датычаць фарміравання моўнага боку выказвання. З'яўляецца канцэпцыя стылю ў рамантычным духу, якая разглядае яго як выяўленне творчай індывідуальнасці. Антыкласіцысцкая стылістычная думка засяроджвае ўвагу на мастацкай творчасці. Рамантычныя тэарэтыкі (у тым ліку І. В. Гётэ) лічаць, што ля вытокаў творчага працэсу знаходзіцца паэтычнае натхненне, або прыроджаны талент паэта. Літаратурны твор разглядаецца як спосаб самавыяўлення аўтара. Месца канцэпцыі *mimesis* (прынцып творчага пераймання класічных твораў, які быў распаўсюджаны ў эпохах Антычнасці і Адраджэння), займае канцэпцыя выражэння (экспрэсіі). Стыль пачынае лічыцца найвышэйшым творчым прынцыпам кампазіцыі твора.

У XIX ст. веды пра стыль разглядаюцца ў новым літаратуразнаўстве і мовазнаўстве. Аднак толькі ў пачатку XX ст. стылістыка становіцца цалкам навуковай дысцыплінай. Яна распрацоўвае свае тэарэтычныя канцэпцыі. У першыя дзесяцігоддзі XX ст. аформіліся чатыры стылістычныя школы: нямецкая неаідэалістычная, французская, расійская фармальная і пражская.

Нямецкая неаідэалістычная школа (К. Фослер, Л. Спітцэр) звяртаецца да рамантычнай традыцыі, якая паходзіць ад Гётэ, і да пагляду італьянскага эстэтыка Б. Крочы, які разглядае мастацкі твор як адзінае і непаўторнае цэлае. Стыль – гэта толькі інтуітыўна ўспрымальны прынцып, які фарміруе тэкст і з'яўляецца «экспрэсіяй духу» мастака. Галоўны прынцып стылістыкі, паводле Фослера, гучыць так: «Колькі індывідуальнасцяў, столькі стыляў». Усе моўныя элементы разглядаюцца як стылёвыя сродкі. Аб'ектам аналізу з'яўляюцца выключна мастацкія тэксты.

Амаль адначасова з неаідэалістычнай літаратуразнаўчай стылістыкай развіваецца мовазнаўчая школа французскай стылістыкі. Яе асновы заклаў сваёй экспрэсіўна-эмацыянальнай стылістыкай Шарль Балі. Полем яго зацікаўленняў стала эмацыянальна-экспрэсіўная значнасць моўных сродкаў. Класіфікацыя гэтых сродкаў паводле абставін, у якіх яны ўжываюцца, паказала, што стылістычныя сродкі трэба разглядаць сістэмна. Прадаўжальнікі Балі (напр., Марузо) таксама зацікавіліся пытаннем выбару стылістычна значных сродкаў у момант маўлення. Французская школа ў значнай ступені паспрыяла фарміраванню «класічнага» азначэння стылю, якое дагэтуль застаецца вельмі пашыраным у стылістычнай літаратуры, а менавіта стыль – гэта прынцып выбару і арганізацыі моўных сродкаў у тэксце.

Вельмі разнастайныя ўплывы (у тым ліку рытарычныя) сфарміравалі расійскую фармальную школу (Б. Эйхенбаўм, У. Проп, Б. Тамашэўскі, Ю. Тынянаў, В. Шклоўскі, В. Жырмунскі). Увага фармалістаў звярталася галоўным чынам на літаратурны твор і паэтычную мову. Літаратурнасць тэксту, на іх думку, вызначаецца арганізацыяй творчага матэрыялу, які складаюць не толькі моўныя, але і кампазіцыйныя і тэматычныя сродкі. Сам стыль фармалісты абмяжоўвалі моўным бокам тэксту, зводзячы стылістыку да раздзела паэтыкі. Гэта паўплывала на бачанне стылістыкі ў літаратуразнаўстве, якое існуе да сённяшняга часу.

Сярод іншых рускіх вучоных, якія прысвячалі свае даследаванні пытанням стылістыкі, трэба пералічыць А. Патабню, Д. Аўсяніка-Кулікоўскага, Л. Шчэрбу, А. Пяшкоўскага, Р. Вінакура, В. Вінаградава, Л. Булахоўскага, А. Гвоздзева, А. Яфімава, Д. Разенталя, М. Кожыну.

Уклад расійскай фармальнай школы ў сферы даследаванняў тэксту паўплываў на ўсе тагачасныя і пазнейшыя школы, у тым ліку і на пражскую (В. Гарванэк, Р. Якабсан, В. Матэзіус, Я. Мукароўскі) і яе канцэпцыю функцыянальнай стылістыкі. Функцыянальная стылістыка стала ў мовазнаўчай стылістыцы XX ст. найбольш уплывовым напрамкам стылістычных даследаванняў, асабліва ў Сярэдняй і Усходняй Еўропе. Цэнтральнай катэгорыяй стылістыкі прадстаўнікі пражскай шко-

лы прызналі паняцце функцыянальнага стылю як разнавіднасці мовы (вылучаны, між іншым, такія асноўныя стылі, як размоўны, мастацкі, навуковы, афіцыйны, публіцыстычны, рэлігійны). Такім чынам, яны зрабілі прадметам стылістыкі ўвесь тэкстава-моўны універсум і паступова пачалі звяртаць усё большую ўвагу на тэкст і яго стыль.

Вытокі беларускай стылістыкі трэба шукаць у творчасці знакамітых культурных постацяў нашай гісторыі, якія адыгралі вялізную ролю ў развіцці моўнай культуры, яе пашырэнні сярод народных мас на тэрыторыі Беларусі XVI–XVII стст. Старабеларуская мова дасягнула прызнаных вышынь не толькі ў мастацкім і публіцыстычным стылях, але і афіцыйна-дзелавым, канцылярскім і навуковым пісьменстве старажытнай Беларусі.

Так, у стражытнай Беларусі дзякуючы сваім прамовам праславіўся адзін з найбольш таленавітых пісьменнікаў XII ст. Кірыла Тураўскі. Ён увайшоў у гісторыю як выдатны майстар урачыстага царкоўнага красамоўства. Глыбокае веданне рыторыкі, незвычайны аратарскі і пісьменніцкі талент дазволілі яму з сапраўдным майстэрствам складаць павучанні, малітвы, каноны, прыпавесці, казанні («словы»), якія ўвайшлі ў скарбонку найлепшых узораў красамоўства.

Як выдатны творца праславіўся таксама Грыгорый Цамблак, царкоўны і асветніцкі дзеяч канца XIV – пач. XV ст., непрызнаны кіеўскі і літоўскі мітрапаліт. Нарадзіўся ў Тырнаве (Балгарыя), быў вучнем балгарскага асветніка Я. Тырнаўскага. Пазней, пераехаўшы на тэрыторыю ВКЛ, прымаў актыўны ўдзел у царкоўным і грамадска-палітычным жыцці княства. У канцы жыцця быў вымушаны пакінуць княства і з'ехаць у Сербію, а пазней – Малдавію, таму яго творы залічваюць да балгарскай, старабеларускай, рускай і сербскай літаратур. Г. Цамблак – аўтар больш чым 20 твораў і пропаведзяў, у прыватнасці «Пахавальнае слова мітрапаліту Кіпрыяну», «Пахвала Яўфімію Тырнаўскаму», «Жыццё Стэфана Дэчанскага» і інш. Як прапаведнік Г. Цамблак пераймаў візантыйскія ўзоры, але часам даходзіў да такой пампезнасці, якая рабіла яго казанні малазразумелымі. У асноўным яго творы прысвячаліся розным святам і ўрачыстасцям.

Выдатным помнікам беларускага гуманістычнага пісьменства з'яўляюцца прадмовы і пасляслоўі Францыска Скарыны да кніг Бібліі. Адрасуючы свае выданні шырокай чытацкай аўдыторыі, Скарына сціслa пераказвае і даступна тлумачыць кожную кнігу, дадаткова каментуе пэўныя словы, каб дапамагчы ў самастойным разуменні складаных біблейскіх тэкстаў. Скарына не проста тлумачыць змест асобных кніг Бібліі, каб «люде посполитые могли лепей разумети», ён дае тлумачэнні літаратуразнаўчага характару. Аўтар прадмоў разглядае не толькі ідэйныя і зместавыя асаблівасці кніг, але і форму выкладу, прыёмы выяўлення, асаблівасці будовы твора, кампазіцыю.

Прапагандуючы ў сваёй дзейнасці сем «вызваленых навук», Скарына асабліва падкрэсліваў сярод іх рыторыку, раіў вывучаць яе па кнігах Саламонавых. Беларускі першадрукар не толькі папулярызаваў гэту навуку, але і сам выкарыстоўваў яе на практыцы. У прадмовах прасочваюцца асноўныя патрабаванні рыторыкі: адметныя падыходы да раскрыцця тэмы, прыёмы і спосабы ўздзеяння на чытача з мэтай выклікаць у яго адпаведны душэўны водгук – пераканаць або ўсхваляваць ці схіліць да сябе, абудзіць эстэтычныя пачуцці (захапленне, асалоду і да таго пад.). Асабліва выразна гэта можна заўважыць у прадмове да Псалтыра, арыентаванай не столькі на перакананне, колькі на эмацыянальнае ўздзеянне. Прыклад дзелавой размовы, майстэрства доказу, лагічнага ўздзеяння на розум чытача можна знайсці ва ўступе да кнігі «Другазаконне».

На старабеларускай мове гаварыў свае прамовы вядомы дзеяч беларускай мінуўшчыны, прыроджаны дыпламат і палітык, таленавіты пісьменнік-публіцыст Леў Сапега. Узорам дзяржаўнага красамоўства лічыцца выступленне Л. Сапегі з нагоды зацвярджэння Статута ВКЛ (1588), а сам Статут і да сённяшняга дня застаецца выдатным помнікам афіцыйна-дзелавой (канцылярскай) пісьменнасці.

Шырокую вядомасць на Беларусі набылі прадмовы да рэлігійных кніг Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, казанні Мялеція Сматрыцкага, Лявонція Карповіча, Афанасія Філіповіча. Яны характарызуюцца своеасаблівымі спосабамі і прыёмамі выкладу думак, спецыфічным адборам моўных сродкаў.

З XV і да сярэдзіны XVI ст. на старабеларускай мове, адзінай афіцыйнай на ўсёй тэрыторыі ВКЛ, пісаліся творы самай разнастайнай стылёвай прыналежнасці. Знакаміты беларускі педагог Лаўрэнцій Зізаній надрукаваў першы на Беларусі буквар з малюнкамі ў тэксце і беларускім слоўнікам (Вільня, 1596), якія дапамагалі разуменню стараславянскай мовы, а таксама падручнік стараславянскай мовы «Грамматика словенска...» (Вільня, 1956), дзе паказаны фанетычныя і лексічныя асаблівасці беларускай мовы. Падобны падручнік па стараславянскай мове «Грамматика славенския правилное синтагма» выдаў і Мялецій Сматрыцкі. Згаданыя працы заклалі асновы навуковага стылю старабеларускай мовы.

На беларускай, польскай, стараславянскай мовах пісаў вядомы беларускі і рускі грамадскі

і царкоўны дзеяч, педагог, пісьменнік, публіцыст Сімяон Полацкі (1629–1680).

У сярэдзіне XVII ст. пад уплывам гістарычных фактараў пачынае абмяжоўвацца сфера афіцыйнага выкарыстання беларускай мовы. Але цікавасць народа да яе не знікла. У саракавыя гады «Граматыку словенскую» напісаў на лацінскай мове беларускі студэнт парыжскага універсітэта Іван Ужэвіч. У ёй аўтар апісвае тагачасную беларускую мову. З'яўленне такіх твораў вельмі паказальная з'ява для высокага ўзроўню беларускай лінгвістычнай думкі таго часу.

Як вядома, у 1579 г. у Вільні быў створаны першы універсітэт Вялікага княства Літоўскага. Сярод іншых дысцыплін там выкладалася і рыторыка. Адзін з выпускнікоў Віленскага універсітэта Сігізмунд Лаўксмін, які працаваў настаўнікам рыторыкі ў полацкай езуіцкай калегіі, а потым выкладаў паэтыку ў Нясвіжы, напісаў па-лацінску падручнік «Практычнае красамоўства». Гэта кніга атрымалася настолькі ўдалай, што перавыдавалася адзінаццаць разоў у буйных друкарнях Еўропы. У сваім творы С. Лаўксмін падкрэсліваў значэнне маўлечнай культуры ў развіцці грамадства.

У другой палове XVII – першай палове XIX ст. беларуская мова развівалася пераважна ў вуснай форме. Гэта прывяло да ўзнікнення багатай вуснай народнай творчасці і паўплывала на некаторыя стылістычныя рысы беларускай мовы, якая фарміравалася на аснове народных гаворак. У прыватнасці, беларуская мова не ведае такога жорсткага супрацьпастаўлення кніжнага і гутарковага стыляў, як у іншых мовах. Дзякуючы вусна-гутарковай аснове, сучасная беларуская мова адзначаецца высокім камунікатыўным патэнцыялам, багаццем фразеалогіі і неаслабнай повяззю з жывымі народнымі вытокамі.

У другой палове XIX ст. беларуская мова вяртаецца ў мастацкую літаратуру. Палеміка Альгерда Абуховіча і Францішка Багушэвіча наконт ужывання дыялектызмаў паглыбіла ўвагу да пытанняў культуры маўлення. Літаратурныя творы Каруся Каганца, Янкі Лучыны, Цёткі, Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага вызначылі напрамкі развіцця беларускай літаратурнай мовы.

Першую спробу зрабіць навуковае апісанне беларускай мовы ажыццявіў у сярэдзіне XIX ст. вядомы беларускі этнограф, пісьменнік і перакладчык Павел Шпілеўскі. Пазней беларускую мову і культуру актыўна вывучаў заснавальнік беларусістыкі Яўхім Карскі, які падсумаваў вынікі сваёй працы ў трохтомным даследаванні «Беларусы».

Сапраўдным штуршком у развіцці беларускай мовы і яе нармалізацыі стала з'яўленне беларускамоўнай прэсы. Напрыклад, на старонках газеты «Наша Ніва», якая выдавалася ў 1906–1914 гг., абмяркоўваліся самыя розныя пытанні граматычнага, лексічнага і стылістычнага ўпарадкавання мовы. Выпрацаваныя ў той час нормы беларускай мовы былі зафіксаваны ў «Беларускай граматыцы для школ» Браніслава Тарашкевіча, а пазней – і ў іншых нарматыўных падручніках і слоўніках.

У беларускай філалогіі першыя распрацоўкі пытанняў стылю з'явіліся ў 20-я гады. Але больш сістэмна яны пачалі вывучацца ў пасляваенны перыяд. Значную ролю ў развіцці беларускай стылістыкі адыгралі Якуб Колас, Кузьма Чорны, Кандрат Крапіва, Максім Лужанін, Янка Скрыган, Пятро Глебка, Янка Брыль і інш.

Беларуская стылістыка дасягнула найлепшых вынікаў у галінах даследавання праблем мастацкага стылю (А. Адамовіч, Р. Шкраба, А. Яскевіч, У. Юрэвіч, П. Дзюбайла і інш.), лінгвістычнай стылістыцы і культуры мовы (Ф. Янкоўскі, У. Анічэнка, А. Аксамітаў, А. Баханькоў, М. Бірыла, Л. Бурак, М. Булахаў, І. Германовіч, А. Жураўскі, Я. Камароўскі, А. Міхневіч, А. Клышка, В. Протчанка, П. Сцяцко, Л. Шакун і інш). Комплексныя стылістычныя даследаванні сучаснай беларускай мовы праводзілі А. Юрэвіч, М. Цікоцкі, А. Каўрус, У. Анічэнка і некаторыя іншыя даследчыкі. Найменш распрацаваны ў беларускім мовазнаўстве функцыянальна-стылістычны напрамак даследаванняў.

На сённяшні дзень цэнтральнае паняцце стылістыкі – стыль як агульны прынцып інтэгравання ўсіх элементаў тэксту, аснова еднасці ўсіх разнародных кампанентаў: моўных, экстралінгвістычных, невербальных, кампазіцыйных, жанравых, тэматычных. Такім чынам, тэкст і яго стыль разглядаюцца як сума ўзаемадзеяння традыцыі (моўна-стылістычных норм), камунікатыўнай сітуацыі і творчага ўдзелу саміх стваральнікаў пэўнага тэксту.